**КУТЫРО́ВА-ЧУБА́ЛЯ** Галіна Рыгораўна (н. 10.3.1953, Мінск), этнамузыколаг. Кандыдат мастацтвазнаўства (2002). Скончыла Бел. кансерваторыю (1977). У 1978—88 і 1992—97 у Бел. універсітэце культуры, у 1988—92 у Навукова-даследчай лабараторыі дыялекталогіі і фальклору БДУ. Працуе ў галіне тэарэтычнай і практычнай фалькларыстыкі. Вывучае марфалогію меладычных тыпаў, формаўтварэнне і меладычны сінтаксіс, музычную дыялекталогію. Музычны ўкладальнік і аўтар нотных расшыфровак архіўных (БДУ) і ўласных палявых запісаў для зборніка «Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць» (1995). Удзельнічала ў падрыхтоўцы і правядзенні тэматычных перадач цыкла «Радыёклуб «Фальклор» (1984—97; з Т.П.Песнякевіч). З 1997 жыве ў Польшчы.

*Тв.:* О структурно-композиционных особенностях белорусских жнивных песен // Вопросы стиля в народной музыке. М., 1986; Дыяхронны аналіз беларускіх жніўных напеваў // Крыўя. Мн., 1998. Вып. 1(3); Жанровый напев и диалектная среда (на белорусском песенном материале) // Музыка устной традиции. М., 1999; От просодии к монодии. О природе интонирования белорусских жнивных песен // W kzęgu kultury słowian. Katowice, 1999.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ